# Сэкцыя беларускіх песьняроў і пісьменьнікаў пры Доме Працаўнікоў Асьветы

18-га красавіка адбыўся сход беларускіх песьняроў і пісьменьнікаў, скліканы Домам Працаўнікоў Асьветы. Прысутнічала 13 чалавек, у большасьці ўсе „маладыя“, і сярод іх старшынёю сходу Зьмітрок Бядуля. Загадчык Дому т. Тэрро паведаміў аб агульных мэтах і заданьнях Дому і ўмовах, на якіх магчыма ўтварэньне сэкцыі беларускіх пісьменьнікаў. Пасьля сьціслых перагавораў аб мэтах і заданьнях асабістай сэкцыі аднагалосна пастаноўлена сэкцыю заснаваць на грунце пролетарскага літаратурнага самавыхаваньня і пашырэньня сярод сяброў Дому працоўнай беларускай літаратуры ў форме вечароў сэкцыі, вечароў твораў паасобных сяброў сэкцыі, вечароў альманахаў і інш. Для часовага кіраваньня справамі, зьвязанымі з заснаваньнем сэкцыі, выбіраюцца Бядуля й Александровіч, якім і даручана саставіць сьпісы ўсіх пісьменьнікаў беларускіх у Менску і ўвайсьці ў Праўленьне з просьбаю зацьвердзіць сэкцыю ў вызначаным складзе. Далей намечаны плян на бліжэйшы чарговы сход сэкцыі і прапанована кіраўніком запрасіць на яго ўсіх песьняроў і пісьменьнікаў беларускіх, якія пражываюць у Менску.

*1923*